

Суарганізатар Беларускіх музычных сезонаў у Францыі Георгій Сасноўскі і Павел Латушка



Удзел калектыву "Церніца" ў акцыі "Заспяваем гімн Беларусі разам". Парыж.



Выступ "Песняроў" у Парыжы.



Выступ ансамбля "Прымакі" ў Парыжы.

аб'ядноўвае ў адно цэлае — сусветную культуру. Калі мы глядзім на неба, на вясёлку пасля дажджу, то яна вабіць нашае вока перадусім таму, што мае розныя колеры. Так і культурная палітра свету з'яўляецца яркай і непаўторнай дзякуючы адметным асаблівасцям культур розных народаў. І наша задача найперш у тым, каб выявіць тыя асаблівасці, узбудзіць за мяжой цікавасць да спазнання нашай культуры.

**— На вашу думку, ці захаваліся прынцыповыя адрозненні паміж нашымі мастакамі і заходнімі? Альбо беларускае мастацтва можна лічыць цалкам інтэграваным у еўрапейскі кантэкст?**

— Тое, што беларуская культура з'яўляецца часткай еўрапейскай, для мяне несумненна. І запатрабаванасць за мяжой нашага выяўленчага мастацтва, якое мае свае глыбокія карані і традыцыі, пераканаўча пра гэта сведчыць. За мінулыя шэсць гадоў мы прадставілі больш як 100 сучасных беларускіх мастакоў на розных французскіх выставах — у тым ліку, і такіх прэстыжных, як "Восеньскі салон" на Елісейскіх палях і "Арт-Капітал" у парыжскім Гранд-Пале. Сам факт атрымання нашымі мастакамі прэмій асацыяцыі барона Тэйлара з'яўляецца красамоўным сведчаннем прызнання сучаснага ўзроўню беларускага выяўленчага мастацтва.

## ВОГНІШЧЫ ПАСЯРОД ПУШЧЫ

**— Вы штогод наведваеце тыя яскравыя фэсты, якія ладзяць на Беласточчыне гурт "Прымакі". Прыязджалі туды з Мінска, а потым ужо і з Парыжу...**

— Вельмі ўдзячны лёсу, які скіраваў мяне на першую дыпламатычную працу менавіта ў Беласток. Уявіце сабе: мне 23 гады, я толькі-толькі пачынаю кар'еру... І раптам трапляю на свята Спаса на святой гары Грабарка, што каля мястэчка Сямятычы, дзе сабраліся дзясяткі тысяч вернікаў. Уражанні былі незабыўныя. Або Свята беларускай культуры ў Беластоку, якое збірае тысячы ўдзячных гледачоў! Або традыцыйнае беларускае Купалле ў Белавежы: казачныя вогнішчы пасярод пушчы, 10 — 15 тысяч удзельнікаў — і ўсюды гучаць беларускія словы і песні... Гэта кранае душу і не можа не пакінуць у ёй свой адбітак. Шмат у чым менавіта кантакты з беларусамі ўсходняй Польшчы і наведванне іх імпрэзаў далалі мне стымулу падтрымліваць уласную беларускасць і натхнілі працаваць для нашай культуры. Мне падаецца, што той, хто не спрычыніўся да пазнання жыцця беларусаў Беласточчыны, не зможа поўнасцю зразумець важнасць падтрымкі беларусаў замежжа.

**— А ў чым жа ўнікальнасць беларускай дыяспары ў Польшчы? Што вас настолькі ўразіла, каб сентымент да гэтага краю вы захоўвалі на ўсё жыццё?**

— Беларусы ў Польшчы з'яўляюцца карэннымі жыхарамі, яны стагоддзямі пражывалі там, дзе жывуць сёння, нягледзячы на змены мяжы. Таму і называюць сябе не дыяспарай, а беларускай этнічнай меншасцю. Яны праз стагоддзі захавалі беларускую мову, з пакалення ў пакаленне перадаюць народныя звычаі, падтрымліваюць традыцыі Праваслаўнай царквы. На Беласточчыне існуюць дзясяткі беларускіх калектываў, што выконваюць як традыцыйныя народныя, так і сучасныя беларускія песні. Словы да іх нярэдка пішуць мясцовыя паэты, члены літаратурнага аб'яднання "Белавежа": Алесь Барскі, Ян Чыквін, Віктар Швед, Міра Лукша ды іншыя.

Дзякуючы самаахвярнай і самаадданай працы актывістаў старэйшай беларускай арганізацыі — Беларускага грамадска-культурнага таварыства, а таксама Таварыства беларускай культуры, журналістаў "Тыднёвіка Ніва", часопісаў "Часопіс" і "Прагляд Праваслаўны", беларускай рэдакцыі "Радыё Беласток" і шматлікіх іншых арганізацый і дзеячаў, беларускае слова з гонарам лунае над беластоцкім краем — над "Сямятычамі, Гайнаўкай і Бельскам старынным..."

Беларусы Польшчы любяць "свой край, старонку гэту, дзе нарадзіліся, раслі, дзе першы раз пазналі шчасце, слязу, нядолі гралілі...", як пісала паэтэса Канстацыя Буйло. Але ля вытокаў усяго знаходзяцца беларускія дзіцячыя садкі і школы, ліцэі і, безумоўна, сям'я як асноўная школа захавання і выхавання традыцый.

**— Але таксама, напэўна, і пасіянарнасць тых, хто руліцца пра культурнае жыццё на Беласточчыне? Узяць хаця б таго ж лідара "Прымакоў" Юрку Астапчука...**

— "Прымакоў" я ведаю ўжо больш за 20 гадоў. Ганаруся тым, што ў гэтым калектыве з 15 гадоў спявае мая дачка. Адзін з самых папулярных беларускіх эстрадных ансамбляў у Польшчы неаднойчы выступаў і ў Беларусі. Ён вабіць беларускай песняй як людзей старэйшага ўзросту, так і, што асабліва важна, маладое пакаленне і збірае на канцэрты тысячы гледачоў. "Прымакі" — яскравы, але не адзінкавы прыклад папулярных сярод беларусаў Польшчы калектываў.

## ПРА БЕЛАРУСКУЮ ДЗЯРЖАВУ

**— А што б вы параілі сказаць выпадкова сустрэтаму замежніку, які лічыць Беларусь усяго толькі нейкім аскепкам колішняга СССР?**

— Што асновы беларускай дзяржаўнасці маюць глыбокія карані, якія вядуць яшчэ з часоў Полацкага і Тураўскага княстваў, са з'яўлення на нашай зямлі гарадоў, старэйшых за многія еўрапейскія сталіцы. Далей — ВКЛ, Магдэбургскае права, стварэнне БНР і БССР. А потым заканамерным чынам узнікла краіна, якая сёння называецца Рэспублікай Беларусь — не штучнае фармаванне, а вынік натуральнай гістарычнай пераемнасці.

К